Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Баранавічы, Брэст, Магілёў: судовы пераслед удзельнікаў акцый пратэсту

дапоўнена

14.03.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, акцыі, свабода мірных сходаў

**У БЕРАСЦІ** зранку распачаўся адміністрацыйны працэс над над блогерамі **Сяргеем Пятрухіным і Дзмітрыем Гарбуновым**, якіх вінавацяць ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве.

Сведкамі па справе Гарбунова выступаюць супрацоўнікі міліцыі **Сцяпірка і Грышкоў**. Справу разглядае суддзя **Святаслаў Каліна**. Ён забараніў весці фота і відэа трансляцыю.

Суд над блогерам Пятрухіным праходзіць у ягоную адсутнасць. Суддзя Семянчук прымае рашэнне - 15 сутак арышту за парушэнне ч. 1 арт 23.34 КаАП.

Таксама 15 сутак арышту Дзмітрыю Гарбунову па арт.23.34 КаАП.

**Уладзімір Асінчанка**, які быў затрыманы за распаўсюд улётак з інфармацыяй аб часе правядзення Маршы недармаедаў 12 сакавіка ў Берасці, атрымаў 7 сутак арышту.



**У БАРАНАВІЧАХ** пачынаецца разгляд адміністрацыйных спраў удзельнікаў Маршу недармаедаў, які прайшоў у горадзе 26 лютага. Судзіць будуць **Міхаіла Стрэльчыка і Барыса Шырынгу**. Суды над імі пачнуцца аб 11.30.  Стала вядома, што разгляд адміністрацыйных спраў Міхаіла Стрэльчыка, Барыса Шырынгі і **Яўгена Жураўскага** перанесены. Суды адбудуцца 15 сакавіка. Пачатак ў 10 гадзін. Суддзя **Аксана Копач**.

А 15 сакавіка а 14.30 ў Баранавічах будуць судзіць актывіста **Міколу Чарнавуса** і яго сына **Міколу Чарнавуса-малодшага** за акцыю 26 лютага.

**МАГІЛЁЎ.** Раніцай 14 сакавіка магілёўскаму актывісту **Алегу Аксёнаву** патэлефанаваў маёр Слаўнікаў і запрасіў на 11-00 ў Ленінскі РАУС. Алег адказаў, што не бачыць падстаў. Маёр жа адказаў, што хутка падвязуць позву. Праз 40 хвілінаў на кватэру да  Аксёнава прыйшла група супрацоўнікаў міліцыі, уручылі позву на 9-30 і забралі з сабой у аддзяленне міліцыі. Яго вінавацяць у арганізацыі «Прагулкі недармаедаў», якая адбылася 19 лютага на цэнтральнай вуліцы Ленінскай.

Аксёнава пасля складання пратакола аб правапарушэнні адразу павезлі ў суд Ленінскага раёна Магілёва.  Суддзя Ленінскага раёна Таццяна Рубіс вынесла пастанову - Аксёнаву прысудзіць 15 сутак арышту па ч.1 арт 23.34.КаАП.



Стала вядома, што ў Ленінскі РУУС на 14-00 выклікалі актывіста АГП **Уладзіміра Шанцава.** Пасля складання пратаколу правапарушэння Шанцава адвезлі ў суд, а з суда адправілі ў ІЧУ. Разгляд справы прызначаны на заўтра.

Па гэтай жа адміністрацыйнай справе праходзіць і **Анатоль Лябедзька.** Яго лічаць вінаватым у арганізацыі несанкцыянаванай акцыі ў Магілёве — шпацыры недармаедаў 19 лютага. Цяпер Лябедзька адбывае 15-суткавы арышт за акцыю ў Маладэчне 10 сакавіка.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO



## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне





ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

# Спіс палітычных вязняў

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Мы не хочам быць заложнікамі" – акцыя вясноўцаў у Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Заява аб прызнанні палітвязнямі Аляксея Камароўскага, Іллі Шакірава і Барыса Протасава

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ







## ПАРТНЁРСТВА

Рацыя

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

Вытокі

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

